# СВЯТА ПЕРАМОГІ.

**9 Мая беларусы адзначылі адно з самых важных свят у гісторыі краіны — Дзень Перамогі. Для нас гэта не толькі святочны дзень, але і дзень памяці, глыбокай павагі і ўдзячнасці савецкім воінам, працаўнікам тылу, партызанам і падпольшчыкам — усім, хто набліжаў Перамогу.**

## «НАШ ГАЛОЎНЫ АБАВЯЗАК — ЗАХОЎВАЦЬ МІР!»

### Шматтысячнае шэсце адбылося ў Віцебску

**Добрай традыцыяй у паўночным рэгіёне стала віншаванне непасрэдна ў Дзень Перамогі жывых сведкаў далёкіх ваенных падзей. Тых, хто больш за восем дзесяцігоддзяў таму стаў на абарону сваёй Айчыны, тых, хто не шкадаваў жыцця дзеля нашага мірнага неба, дзеля шчаслівага існавання мільёнаў нашчадкаў. Сёлета, у 79-ю гадавіну Перамогі над фашызмам, марафон падзякі прыйшоў да 100-гадовых ветэранаў Аркадзя Аднарукава і Георгія Грошава. Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН уручыў пераможцам ганаровыя граматы і падарункі, пажадаўшы доўгіх гадоў жыцця, сіл і міру.**



Фота БелТА.

Урачыстасці ў горадзе на Дзвіне пачаліся са шматтысячнага шэсця па вуліцы Леніна. Кожны з удзельнікаў калоны прайшоў сцежкай памяці не толькі за сябе, але і за кожнага са 118 віцябчан, якія ў далёкім 1945 годзе сустракалі Пераможны Май. Ганаровае месца ў першых радах занялі ўдзельнікі рэспубліканскай патрыятычнай акцыі «Беларусь памятае. Памятаем кожнага» з партрэтамі сваіх блізкіх — працаўнікоў тылу, франтавікоў, партызан.

Старт мітынгу на плошчы Перамогі дала цырымонія ўскладання кветак і вянкоў да Вечнага агню каля манумента ў гонар савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў. Звяртаючыся да жыхароў і гасцей паўночнай сталіцы, кіраўнік вобласці Аляксандр Субоцін яшчэ раз нагадаў аб тых страшных падзеях, якія выпалі на долю нашых продкаў. «Беларусы разам з іншымі брацкімі народамі Савецкага Саюза не схілілі галавы перад акупантамі. У бітве з фашызмам за свабоду мы страцілі кожнага трэцяга жыхара рэгёна. У нашай памяці назаўсёды застануцца не толькі подзвігі франтавікоў і партызан. Гонар і слава працаўнікам тылу, нізкі паклон тым, хто вырошчваў хлеб, выrabляў снарады, ставіў на ногі параненых. Разам з гераічнымі подзвігамі — танкавая бітва пад Сянно, Суражская брама, Ушацкі прарыў — мы не забудзем і карныя аперацыі «Зімовае чараўніцтва», «Вясновае свята». За жахліва лірычнымі і цынічнымі назвамі хаваўся звычайны генацыд — знішчэнне такіх жа, як і мы з вамі, беларусаў. Па сваёй масавасці і жорсткасці (людзей выпальвалі вёскамі) карныя аперацыі на тэрыторыі нашай вобласці ў гады вайны не маюць аналагаў у гісторыі чалавецтва».

Кіраўнік рэгёна падкрэсліў, што за мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны нядаўна пасёлкі Віцебшчыны Асвея і Обаль былі ўзнагароджаны вымпеламі. «Сёння наш галоўны абавязак — захоўваць мір. Хутка мы будзем святкаваць 80-годдзе вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яднанне беларусаў выратавала нас тады ад «карычневай чумы». Адзінымі мы павінны быць і сёння, каб нашы дзеці і ўнукі не пазналі жахаў вайны!» — заклікаў ён.

## «ПАМЯЦЬ НАС АБ'ЯДНОЎВАЕ»

### У Брэсцкую крэпасць прыйшло каля 60 тысяч чалавек

**Святкаванне Дня Перамогі ў Брэсце пачалося з мерапрыемстваў у кожным з двух раёнаў горада. Шостага і сёмага мая ў Ленінскім і Маскоўскім раёнах прайшлі мітынгі з ускладаннем кветак да памятных мясцін, ушанаваннем памяці герояў вайны і яе ахвяр.**



Фота Тэлеграмканала Брэсцкага гарвыканкама.

Напярэдадні ў горадзе над Бугам адкрыўся міжнародны фестываль хароў хлопчыкаў «Берасцейскія харавыя асамблеі», прысвечаны 80-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Форум сабраў каля 400 выканаўцаў з розных гарадоў Беларусі і Расіі. Усе ўдзельнікі фэсту — шматразовыя лаўрэаты міжнародных конкурсаў, фестываляў, тэлевізійных праектаў, патрыятычных акцый, пастаянныя ўдзельнікі дзяржаўных культурных мерапрыемстваў. Канцэрты хароў адбываліся на розных пляцоўках горада. Калектывы фестывалю сталі ўдзельнікамі мітынгу ў Брэсцкай крэпасці.

А старт святочным мерапрыемствам Дня Перамогі ў Брэсце даў парад з удзелам ваеннай тэхнікі. Роўна ў 9 гадзін пачаўся ўрачысты марш па галоўнай плошчы горада. Лічба 79 тут невыпадковая, менавіта столькі адзінак рэтратэхнікі і сучаснай — за кожны пераможны год — прайшлі ў парадным страі. У пачатку калоны — рарытэтныя «УАЗы» з ветэранамі, затым матацыклы, танк сямейства ІС. А яшчэ прысутных уразіла конніца. Рэканструктары аднавілі вобразы савецкіх кавалерыстаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Тым самым нагадалі, што савецкая конніца адыграла значную ролю ў барацьбе з ворагам. Па плошчы прайшлі рэканструктары, ваеннаслужачыя Брэсцкага гарнізона і органаў пагранічнай службы, сілавых структур, а таксама выхаванцы ваенна-патрыятычных клубаў, вучні кадэцкіх класаў. Абапал дарогі выстраіліся сотні людзей, каб паглядзець на парад. Многія прыйшлі з сем'ямі, дзеці махалі сцяжкамі тым, хто ішоў ва ўрачыстых калонах, дарослыя ўсміхаліся.

Пешая і механізаваная калоны прайшлі пад акампанемент узорна-паказальнага аркестра Брэсцкай пагранічнай групы і аркестра 38-й дэсантна-штурмавой брыгады. Мелодыю вядомай песні «Дзень Перамогі» падпявалі, здавалася, усе. Завяршылася шэсце вынасам аграмаднага палотнішча Дзяржаўнга сцяга Рэспублікі Беларусь, якое пранеслі найлепшыя навучэнцы сярэдніх навучальных устаноў абласнога цэнтра. Затым удзельнікі парада накіраваліся ў Брэсцкую крэпасць. Тым часам сюды ўжо сцякаліся людскія патокі.

У шэсці калоны «Беларусь памятае. Памятаем кожнага» гэтым разам удзельнічала каля сямі тысяч чалавек. Да 11 гадзін, паводле ацэнкі арганізатараў, каля 60 тысяч чалавек сабраліся на плошчы Цырыманіялаў і ў яе ваколіцах.

**Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА** падкрэсліў, што памяць пра вайну аб'ядноўвае беларусаў:

— У краіне робіцца вельмі шмат дзеля захавання памяці. Становяцца даступныя многія архіўныя матэрыялы, якія дазваляюць убачыць тое, што раней заставалася невядомым.

Губернатар падкрэсліў, што брастаўчане вельмі любяць свята 9 Мая. Для кожнага брастаўчаніна крэпасць — сімвал Перамогі, сімвал мужнасці і стойкасці народа. А для патрыятычнага выхавання моладзі, паводле меркавання кіраўніка вобласці, няма лепшага месца, чым Брэсцкая крэпасць.

Адразу пасля мітынгу ў крэпасці пачаўся святочны канцэрт. Зводны хор хлопчыкаў выканаў «Дзень Перамогі», а таксама песні ваенных гадоў. Вечарам па традыцыі тут адбыўся святочны салют.

## «СЁННЯ МЫ ЗНОЎ РАЗАМ»

### Гомель засведчыў памяць Пераможнага Мая

**Сотні гамяльчан розных пакаленняў, цэлыя сем'і жыхароў абласнога цэнтра, госці горада над Сожам з кветкамі, паветранымі шарамі, сцяжкамі віталі парадную калону па вуліцы Савецкай. Разам у ёй прайшлі кіраўніцтва вобласці і горада, ветэраны і вайскоўцы, дэпутаты і парламентарыі, працоўныя калектывы, грамадскія арганізацыі, моладзь.**

Удзельнікі патрыятычнай акцыі пранеслі партрэты сваіх сваякоў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Так жывая плынь памяці — больш чым 20 тысяч удзельнікаў урачыстага шэсця — абвясціла сапраўды народную любоў да свята Вялікай Перамогі.

Ужо амаль дзесяць гадоў Гомель кожны Пераможны Май не перарывае традыцыю народнай акцыі «Беларусь памятае». Палюбілася гараджанам і шэсце на чале ўрачыстай калоны з копіяй Сцяга Перамогі. 12-метровы цэнтральны святочны сімвал — копія таго самага чырвонага сцяга, які ў 1945 годзе быў узняты над Рэйхстагам. Памер гомельскага палотнішча амаль у сем разоў больш за арыгінал.

Традыцыйна 9 Мая сотні жыхароў і гасцей абласнога цэнтра сабраліся ў знакавым месцы памяці Гомельшчыны — каля Вечнага агню на плошчы Працы, каб аддаць даніну павагі і ўшанаваць подзвіг герояў Вялікай Айчыннай. Тут прайшоў урачысты мітынг. Да яго ўдзельнікаў і ўсіх жыхароў рэгёна звярнуўся **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.**

— На жаль, ва ўсім сучасным свеце сёння толькі два народы разам адстойваюць гістарычную праўду — беларусы і расіяне. І сёння мы зноў разам. Наш Прэзідэнт — побач са сваім расійскім калегам на Краснай плошчы ў Маскве, а з намі раздзяляюць вялікае свята браты з Бранскай вобласці. Разам нашы дзяды і бацькі кавалі Вялікую Перамогу, разам і мы захоўваем іх запаветы і памяць аб іх. У гэты свяшчэнны дзень мы адрасуем словы шчырай удзячнасці нашым дарагім ветэранам за ратны подзвіг. Гэта прыклад жыццялюбства і адданасці Айчыне, які яны падаюць нам і па сёння, — падкрэсліў Іван Крупко.

Як нагадаў кіраўнік рэгёна, сёння тысячы помнікаў і мемарыялаў, муралы і музейныя экспазіцыі беражліва захоўваюць памяць народа аб вялікім подзвігу герояў Вялікай Айчыннай вайны.



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

— Мы шчыра ганарымся тым, што сярод больш чым адзінаццаці з паловай тысячы чалавек, удастоеных у гады вайны звання Героя Савецкага Саюза, 449 — беларусы, а 126 — жыхары Гомельскай вобласці. У іх ліку двойчы Герой Савецкага Саюза генерал-маёр авіяцыі Павел Галавачоў, віцэ-адмірал Валянцін Дрозд, браты Лізюковы, — падкрэсліў Іван Крупко.

Атмасферай вялікага агульнанацыянальнага свята напоўнілася гомельская плошча Леніна. Тут прайшоў парад ваеннай тэхнікі з урачыстым шэсцем калоны воінскіх падраздзяленняў, сілавых структур, кадэцкіх класаў. У парадзе было прадэманстравана 25 адзінак ваеннай тэхнікі — аднаўленыя ўзоры, якія былі на ўзбраенні Чырвонай Арміі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і сучасная тэхніка, якая сёння знаходзіцца на ўзбраенні беларускіх вайскоўцаў.